Заданні да конкурсу “Залатая літара”
15.05.2025

**Заданне 1.**
**З прапанаваных варыянтаў выберыце правільнае тлумачэнне наступных слоў.**

**1. Здарожыцца – гэта…**
А. Сыйсці з правільнай дарогі, згубіцца;
Б. Стаміцца, змучыцца ў дарозе;
В. Спыніцца, застацца на начлег.

**2. Кузурка – гэта…**
А. Слізь у насавых пазухах;
Б. Кукурузнае зернетка;
В. Усякае маленькае, дробнае насякомае.

**3. Аблавушка – гэта…**
А. Чалавек, якога падманулі;
Б. Зімовая шапка, вушанка;
В. Сабака з вялікімі вушамі.

**4. Палетак – гэта…**
А. Участак поля, які выкарыстоўваецца пад пасевы;
Б. Цяля або жарабя, што нарадзілася мінулым летам;
В. Птушатка, што вылецела з гнязда гэтым летам.

**5. Праталіна – гэта…**
А. Старажытны музычны інструмент, які выкарыстоўваўся славянамі для стварэння містычных гукаў;
Б. Месца, дзе растаў снег і агалілася зямля;
В. Від ледзяных структуры, якія ўтвараюцца пры сцісканні льдоў.

**6. Калатнеча – гэта…**
А. Сварка, часам з бойкай;
Б. Калі трасуць пладовыя дрэвы, каб сабраць з іх ураджай;
В. Выраб калатушак.

**7. Медуніца – гэта…**
А. Бочка, у якой захоўваюць мёд;
Б. Той, хто любіць ласавацца салодкім;
В. Травяністая расліна з дробнымі пахучымі кветкамі.

**8. Выспа – гэта…**
А. Высыпанні, болькі на целе;
Б. Месца, дзе растаў снег і агалілася зямля;
В. Невялікі востраў, часцей пясчаны.

**9. Адшчапенец – гэта…**
А. Трэска, якую адсеклі ад бервяна;
Б. Чалавек, які адышоў ад свайго калектыву, парваў сувязь са сваім асяроддзем;
В. Металічны інструмент, які выкарыстоўваецца ў кавальскай справе.

**10. Нябожчык – гэта…**
А. Чалавек, які здурнеў, крануўся розумам;
Б. Чалавек, які не верыць у Бога;
В. Мёртвы чалавек.

## Заданне 2.
## Устанавіце адпаведнасць паміж беларускімі і рускімі ўстойлівымі выразамі.

| № | Фразеалагізм | Літара | Значэне |
|---|---|---|---|
| 1 | Без ножа резать | А) | Як вадой разліўся |
| 2 | Взялся за гуж, не говори, что не дюж | Б) | І бога не гнявіць і чорту дагадзіць |
| 3 | Будет и на нашей улице праздник | В) | Анёлам ляцеў, а чортам сеў |
| 4 | Делу время, а потехе час | Г) | Хто парасё ўкраў, таму ў вушах пішчыць |
| 5 | И нашим и вашим | Д) | Перш папрацуй, а тады і патанцуй |
| 6 | Как сквозь землю провалился | Е) | Без агню пячы |
| 7 | На воре шапка горит | Ё) | Ні вокам не відаць, ні слыхам не чуваць |
| 8 | Ни слуху, ни духу | Ж | У тую пару, калі рак паляціць з вады ў гару |
| 9 | После дождичка в четверг | З) | Калі ўлез у дугу – не кажы “не магу” |
| 10 | Волк в овечьей шкуре | І) | Загляне сонца і ў наша аконца |

## Заданне 3
## У філвордзе схаваныя назвы кветак, якія адлюстраваны на малюнках. Знайдзіце назвы і запішыце ў табліцу насупраць малюнка з гэтай кветкай.

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Ё | Я | Ц | Ё | В | А | С | І | Л | Ё | К | А |
| Д | Д | Ы | Р | Х | К | А | С | А | Ч | Р | Е |
| З | Г | А | Р | Л | А | Ч | Ы | К | Б | Д | Ю |
| Ь | Ъ | Л | Т | Г | М | Н | Р | Л | Б | А | З |
| М | Ь | Т | Л | І | Л | Е | Я | У | Р | Щ | В |
| У | Н | Ш | Ы | П | Ш | Ы | Н | А | А | Н | А |
| Х | Р | А | М | О | Н | А | К | З | Т | Ё | Н |
| А | Ж | Д | О | Н | К | Ф | Ы | А | К | В | О |
| В | У | Г | П | І | В | О | Н | Я | І | Й | Ч |
| Е | Ю | И | С | К | Т | И | Ы | А | Ы | М | А |
| Ц | Т | Ф | М | Ю | П | В | Л | Е | Ш | Й | К |
| М | Д | О | К | Й | М | Й | Ы | Г | П | М | О |

1)  2)  3)  4)  5) 

6)  7)  8)  9) 

10) 

## Заданне 4

**Суаднясіце назвы літаратурных твораў з ілюстрацыямі да іх і імёнамі аўтараў**

1)  2) 

3)  4) 

5) 

6) 

7) 

8) 

9) 

10) 

**А) Анатоль Кудравец**
**Б) Генрых Далідовіч**
**В) Максім Лужанін**
**Г) Міхась Лынькоў**
**Д) Народная легенда**
**Е) Народная казка**
**Ё) Андрэй Федарэнка**
**Ж) Якуб Колас**
**З) Уладзімір Караткевіч**

### Заданне 5

**Частка А. Адгадайце загадкі:**

1. Кішэні не мае, а сонца хавае, страху не мае, а ад ветру ўцякае, вачэй не мае, а слёзы пралівае.
2. За сцяною касцяною балалайка грае.
3. Тоўсты тонкага паб’е, тонкі што-небудзь прыб’е.
4. Вісіць сіта, не рукамі звіта
5. Два браты ў ваду глядзяцца, а разам не сходзяцца.
6. Па полі ходзіць і дзіркі робіць.
7. У жываце лазня, у носе — рэшата, на галаве пупок, адна ручка, і тая на спіне.

**Частка Б. Прыдумайце загадку з наступнымі ўмовамі:**
**у выглядзе чатырохрадкоўя, каб была рыфма, з адгадкай ‘вясёлка’, ‘сняжынкі’ або ‘пальцы’.**

*<u>Напрыклад:</u>*
Матылі насіліся,
Над зямлёй кружыліся,
А як долу ўпалі –
Белым пухам сталі. (Сняжынкі)